Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**М.М. Караткоў *(Магілёў)***

# “АПОВЕСЦІ ІВАНА АНДРЭЕВІЧА” І.ШАМЯКІНА Ў КАНТЭКСЦЕ ЯГО ТВОРЧАСЦІ

Сярод шматлікіх аповесцей і раманаў, напісаных І.Шамякіным за апошняе дзесяцігоддзе, “Аповесці Івана Андрэевіча” (1992) выклікаюць цікавасць па некалькіх прычынах. Па-першае, яны адзначылі пачатак новага этапу ў яго творчасці. Пасля рамана “Злая зорка”, аповесцей “Ахвяры” і “Драма”, прасякнутых пафасам адмаўлення сталіншчыны, каманд-на-адміністрацыйнай сістэмы і рэцэдываў гэтых з'яў у часы перабудовы, іх аўтар звярнуўся да асэнсавання жыцця ва ўжо незалежнай тады Беларусі. І ў згаданых вышэй “Аповесцях...” даволі выразна акрэсліліся некаторыя тэндэнцыі далейшага развіцця прозы пісьменніка.

Па-другое, сам змест невялікіх аповесцей “Paradies auf Erden” і “Вернісаж”, што складаюць “Аповесці Івана Андрэевіча”, дае пэўныя падставы гаварыць аб іх як аб своеасаблівай антыутопіі. Тады, на пачатку 90-х, у пераходзе да рыначнай эканомікі многім бачылася панацэя ад той галечы, у якой апынулася пераважная частка насельніцтва ў часы перабудовы. Адлюстроўваючы рэчаіснасць той пары, пісьменнік па сутнасці сцвяр-

джае думку, што капіталізм, тым больш на стадыі першапачатковага накаплення капіталу, не нясе разняволення чалавеку, не робіць яго больш чалавечным. “А мы, гледзячы на багаты захад, пасунуліся назад – у дзікі капіталізм. Рынак! На якой аснове рынак? Ідыёты!” [1, 100] – абураецца Іван Андрэевіч, галоўны герой твора. Уласнае становішча, становішча блізкіх, ды і ўсёй краіны бачыцца яму беспрасветным і бесперспектыўным: “ Хаос... Не, не хаос... У хаосе ёсць завяршэнне, пачатак і канец. А я не бачу канца нашага развалу. Чым далей, тым большая памыйка.” [1, 123].

Варта зазначыць, што, даводзячы гэтую думку праз сістэму вобразаў, аўтар часам некалькі згушчае фарбы, магчыма, экстрапалюючы развіццё падзей на недалёкую будучыню. Так, у аповесці гаворыцца, што хлеб прадаецца па талонах і яго не заўсёды хапае на ўсіх: “... так шкада было Марысі, калі некалькі дзён назад не раздабылі хлеба і малака – па талонах хлеба ў чарзе не хапіла, на камерцыйны харч не было грошай” [1, 61]. Няма электрычнасці, у кватэрах холад, і Іван Андрэевіч, жывучы ў шматпавярховым доме, вазіў у дзіцячай калясачцы вугаль і дровы для апалу са склада [1, 74]. Рабочыя кварталы пусцеюць [1, 60]. Небывалыя памеры прымае рабаўніцтва. Холад і голад прымусілі чвэрць насельніцтва Мінска пакінуць горад [1, 60] і шукаць ратунку, як у ваенны ці пасляваенны час, у вёсках. “Людзі, што ўцякаюць з гарадоў, арандуюць хлявы, лазні, будуюць зямлянкі, лезуць у норы, “ [1, 61] – гаворыць вядомы мастак Міхал Рачыцкі, сябра Івана Андрэевіча.

Сумленныя людзі галадаюць. Нават міністр культуры мусіць несці са сталоўкі Савета міністраў булачку і катлету для ўнучкі [1, 100]. Добра жывуць толькі тыя, хто здолеў выкарыстаць сітуацыю і бессаромна нажыцца ў часы “прыхватызацыі”. А для астатніх назва гатэля і крамы “Paradies auf Erden” (“Рай на зямлі”), дзе можна купіць усё, але толькі за валюту, якой няма, гучыць як здзек. Капіталізм – не рай для народа. Думаецца, менавіта гэтую думку імкнуўся падкрэсліць І.Шамякін, даючы назву першай часткі твора.

Не менш увагі ўдзяляе аўтар і праблеме маральнага клімату ў асяроддзі творчай інтэлігенцыі ў гэты няпросты час. Паняцці “пісьменнік”, “мастак” ў беларускай літаратуры заўсёды былі сінонімамі паняццяў “высокая духоўнасць”, “сумленне народа” і г. д.. І.Шамякін паказвае, што матэрыяльнае становішча творчай інтэлігенцыі, як і ўсяго народа, рэзка пагоршылася. Герой аповесці мусіць прадаваць тое, што набыў за доўгія гады пісьменніцкай працы, каб хоць неяк пракарміць сям'ю: “Не, цяпер яшчэ не галадаю. ... Прадаў машыну, дываны, вазы, палавіну бібліятэкі. Во калі прадам свае кнігі...” [1, 52]. Мастак Рачыцкі, які “пры сацыялізме трымаў шафёра, пры капіталізме машыну з’еў, бо і на падрамнікі не хапала” [1, 84].



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Прывід голаду лунае нават над іхнімі сем'ямі, не кажучы ўжо пра менш вядомых дзеячоў нацыянальнай культуры. Попыту на мастацтва ў збяднелай краіне няма. Для многіх праблемай стала проста выжыць. Як скрушна адзначае Іван Андрэевіч, пра літаратуру пісьменнікі гавораць "толькі ў сувязі з тым, як яна корміць. Невялікую групку яна корміць добра, большасць даўно не корміць ніяк" [1, 80]. Расчараванне, скептыцызм, нават змена ідэйных пазіцый, пакланенне залатому цяльцу ў асобных творцаў...

А побач – пратэст супраць цяжкога становішча народа. Як у змесце карціны, вернісажы і самагубстве мастака Рачыцкага. І – спроба разабрацца ў вытоках бяды, якімі ў аповесцях бачыцца адыход ад агульначалавечых ідэалаў, што ўвасоблены ў біблейскіх запаведзях. А для Івана Андрэевіча – і ў марксізме, які ён называе навейшым "Новым заветам" [1, 101]. Страх перад невядомай будучыняй спалучаецца ў яго з настальгіяй па мінуламу, яшчэ зусім нядаўна такому прыкраму, але сытаму, што ў тыя часы было характэрна для многіх. Як і непрыняцце бездухоўнасці "дзікага капіталізму", што выявілася ва ўсёй беларускай літаратуры апошняга дзесяцігоддзя, у тым ліку – і ў творах І.Шамякіна (аповесці "Сатанінскі тур", "Без пакаяння", "Падзенне", "Крывінка" і інш.).

***Літаратура***

1. ***Шамякін І.*** Аповесці Івана Андрэевіча // Маладосць. – 1993. – № 1. – С. 45 – 129.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова